На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб Колас

№ 201 (553)
Аўторак, 10 лістапада 1998 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць — 5 разоў у тыдзень
Кошт: у кіёсках і крамах — 4000 руб., у індывідуальных гандляроў — свабодны.

Народная Воля

Анонс!

Рэтраграды ад гістарычнай навукі і яе фальсіфікатары ад улады імкнуцца загубіць выданне стагоддзя — ХРОНІКУ ПАМЯЦІ БЕЛАРУСІ ў 140 тамах.

Яны разумеюць, што Беларусь, якая прыйдзе да БЕЛАРУСІ праз адраджэнне сваёй гістарычнай памяці, стане непадуладнай авантурыстам і манкуртам.

(Артыкул "Кароткая хроніка памяці ад Суслава да Хахлова з Дамарадам..." чытайце на 2-й старонцы.)

Постскриптум

Профсоюзные активисты не ответили на вопрос журналиста, станут ли они в одну шеренгу с рабочими

Ноябрьская общенациональная акция рабочих Беларуси ясно показала "кто есть кто". Власти, как обычно, начали возводить препятствия. Общественные, политические и профессиональные организации — дискутировать об участии-неучастии.

Федерация профсоюзов, чтобы определиться в своем отношении к акции, провела накануне марша протеста совещание профсоюзного актива Минска. О степени важности рассматриваемого вопроса свидетельствовало то, что в зале присутствовали председатель Совета Министров, заведующий отделом по связям с общественными организациями Администрации президента, министры, городские власти.

Судя по настроению зала, собравшиеся с нетерпением ждали дискуссии по акции протеста. Но этого как раз не желали профбоссы. Президиум собрания во главе с премьером С.Лингом вопрос о поддержании шествия рабочих даже не поставил на голосование. А среди председателей профкомов не оказалось "политруков", готовых под шквальным огнем начальствующих глаз встать и произнести: "За Родину!".

Лидеры федерации решились лишь на проведение для Сергея Степановича "курса ликбеза" о положении дел в экономике страны. Так, заместитель председателя федерации поведал главе правительства, что:

— уровень рентабельности белорусской экономики не обеспечивает не то что расширенного, но даже простого воспроизводства;

— Беларусь инвестирует заграничного производителя, поскольку отрицательное сальдо торговли — более одного миллиарда долларов;

— заработная плата в Беларуси ниже прожиточного минимума и меньше, чем во всех соседних странах;

— данные официальной белорусской статистики не соответствуют действительности;

— за четыре года президентского правления заработная плата уменьшилась в 2 раза — с 2,8 минимального потребительского бюджета стала 1,2 МПБ;

— победа над инфляцией в Беларуси достигается за счет перевода населения страны на хлеб, соль и воду.

Выступающие председатели профкомов, судя по всему, тщательно подобранные президиумом, в основном жаловались на низкую заработную плату и молили главу правительства о помощи. Тем не менее были и "проколы". Так, председатель профкома завода "Калибр" потребовал от власти:

— полностью освободить от обложения подоходным налогом заработную плату в пределах минимального потребительского бюджета;

— предоставить представителям трудовых коллективов и профсоюзов эфирное время на радио и телевидении не менее 30 минут еженедельно;

— наложить мораторий на реконструкцию и строительство крупных зрелищных сооружений и проведение увеселительных мероприятий, требующих значительных денежных затрат;

— сократить государственные расходы на содержание чиновничьего аппарата, в первую очередь силовых ведомств и контрольных служб, а высвободившиеся средства направить на поддержку малообеспеченных слоев населения;

— ликвидировать бюджет Управления делами президента и объединить его с государственным бюджетом.

Кратким, но весьма показательным было выступление председателя профкома роддома. Будучи начинающим врачом, он получал 126 рублей, за которые мог купить 1500 килограммов картошки или 30 бутылок водки. Ныне, являясь врачом высшей категории и имея большой стаж работы, получает 5 миллионов рублей, за которые может купить лишь 300 килограммов картошки, но зато 60 бутылок водки. Выступающий после него С.Линг пообещал поправить ситуацию, подняв цену на водку (что, кстати на днях и сделано). Премьер так ничего и не понял. Профсоюзные "ликбезовские" курсы оказались неэффективными.

Вопрос журналиста "Так пойдете вы вместе с рабочими или нет?", громогласно заданный после закрытия совещания, остался без ответа. Председатели профкомов, проходя мимо представителя СМИ, стыдливо опускали глаза. Ответ на него дали сами рабочие: пространства, отведенного властями для митинга, на всех пришедших не хватило, стояли даже на отдаленных косогорах.

Глава государства к тракторному заводу по требованию народа не прибыл. Для Александра Лукашенко важнее была встреча с провинциальным российским деятелем. Служителя Администрации президента Ивана Пашкевича, который по поручению главы государства прибыл на профсоюзную акцию и стал угрожать увольнением с заводов, закрытием детских садов и прочими карательными мерами, рабочие освистали.

Резолюцию митинга с требованием установления минимальной заработной платы в 100 долларов и предоставления профсоюзам телерадиоэфира отправили в резиденцию президента. Почетный эскорт в составе нескольких сот рабочих, сопровождающий делегацию, скандировал: "Зарплату, зарплату, зарплату!"... Милиция вела себя корректно — его Величество рабочий класс не тронула. Белорусское телевидение тоже не решилось заявить, как обычно, что на митинг собрались те, кому заплатили доллары.

Требования рабочих в Администрации президента зарегистрировали. Профсоюзы предоставили властям время для принятия мер до конца месяца.

Данила ХАЛЕЦКИЙ.

На 15 працэнтаў выраслі цэны на белую гарэлку

З 5 лістапада ў Беларусі на 15 працэнтаў павысіліся цэны на белую гарэлку. Напрыклад, паўлітровая бутэлька "Крышталю-100" каштуе цяпер 102.000 рублёў (замест 89.300), "Крышталю-Люкс" — 106.500 (замест 93.900), "Белай Русі" — 106.300 (замест 93.700).

Як паведамілі ў Міністэрстве эканомікі Беларусі, рост кошту белай гарэлкі выкліканы павышэннем цэн на сыравіну для яе вытворчасці. Паводле звестак БелаПАН, 1 снежня гэтага года белая гарэлка стане даражэйшай яшчэ на 15 працэнтаў. Такім чынам, рост яе кошту за два месяцы складзе 40 працэнтаў (нагадаем, што 8 кастрычніка гарэлка павысілася ў цане на 10 працэнтаў).

Дзмітрый УЛАСАЎ.

У сярэднім на 10 працэнтаў павысіліся цэны на курыныя яйкі

З 5 лістапада ў Беларусі ў сярэднім на 10 працэнтаў павысіліся цэны на курыныя яйкі. Аб гэтым паведамілі ў аб'яднанні "Белптушкапрам". У прыватнасці, адпускная цана аднаго дзесятка яек першай катэгорыі зараз складае 30 тысяч рублёў, другой — 27,5 тысячы рублёў; адпаведна, у залежнасці ад нацэнкі, узрастуць і рознічныя цэны на гэтую прадукцыю ў магазінах.

Па словах начальніка аддзела гандлю "Белптушкапрама" Канстанціна Украінца, павышэнне адпускных цэн на яйкі ў першую чаргу звязана з падаражаннем камбікармоў. Дэфіцыт курыных яек, які мае месца апошнім часам, у аб'яднанні тлумачаць найперш дыспарытэтам цэн на мяса і на яйкі, які стымулюе павышаны попыт, а таксама ўзрастаючымі аб'ёмамі паставак яек за межы краіны — у абмен на неабходныя кармы і абсталяванне. Па некаторых звестках, цяпер гэтая доля перавышае 60 працэнтаў ад агульнага аб'ёму вытворчасці яек.

Да бартэрнага абмену прадпрыемства прымушае адсутнасць валюты з-за немагчымасці канверсавання беларускіх рублёў. Тым не менш, па словах К.Украінца, толькі ў мінскія магазіны за першыя тры дні лістапада было пастаўлена 3 млн. штук яек, хаця летам сутачная норма спажывання складала 600—700 тысяч. Сваю ролю ў нараджэнні чарговага дэфіцыту адыгрываюць і фіксаваныя цэны. Паводле разлікаў спецыялістаў, каб птушкафабрыкі хоць неяк выжывалі ў цяперашніх няпростых умовах, цана аднаго дзесятка яек павінна быць не меншая, як 50 тысяч рублёў.

У "Белптушкапраме" паведамілі, што павышаны попыт, а значыць, і дэфіцыт на гэтую прадукцыю назіраецца не толькі ў сталіцы, але і ў іншых абласных цэнтрах і гарадах рэспублікі.

Аляксей АРЭШКА.

Рецидив

В Бобруйске День Памяти городские власти предложили провести на стадионе. А 80-летие комсомола отмечали в центре города

30 октября члены Бобруйского отделения Белорусской ассоциации жертв политических репрессий провели митинг-реквием в память о безвинно расстрелянных в годы советской власти мужей, отцов, матерей.

Накануне Дня Памяти предков, который республика отмечала 2 ноября, члены ассоциации собрались в центре Бобруйска, чтобы почтить минутой молчания всех погибших, поставить свечи, возложить цветы к Памятнику жертв политических репрессий. Вполне нормальное, объяснимое и понятное каждому решение. Непонятно другое — отношение к акции местных властей.

Как сообщила корреспонденту "Народной воли" председатель Бобруйского отделения Белорусской ассоциации жертв политических репрессий Анна Бакач, на площадь Победы члены ассоциации пришли, "руководствуясь конституционной гарантией о свободе собраний и митингов. Правда, если быть откровенными до конца, городские власти не разрешили членам ассоциации собраться на площади, а выделили иное место — пустынные беговые дорожки стадиона "Фандок".

"В горисполком мы подали заявление о проведении акции, — рассказывает Анна Мартыновна, — но не получили от властей ни отказа, ни разрешения. Совершенно случайно 29 октября в газете "Бобруйский курьер" я прочитала, что нам, членам ассоциации, — старым и немощным людям — городские власти предложили провести День памяти и церковную панихиду на футбольном стадионе "Фандок".

Я приглашала руководителей горисполкома возложить цветы к памятнику, почтить наших предков минутой молчания. Никто из коммунистов-руководителей не пришел.

А накануне праздновали 80-летие комсомола. За счет налогоплательщиков проводили викторины, встречи, вручали ценные призы, открыли выставку, в кинотеатрах крутили фильмы. Среди репрессированных и расстрелянных советской властью было много и комсомольцев, но 29 октября о них никто не вспомнил..."

Члены Ассоциации все же провели митинг-реквием в центре Бобруйска. К счастью, у местных властей хватило здравого смысла не разгонять пожилых людей. 30 октября собравшиеся подписали резолюцию акции протеста, в которой, в частности, сказано: "Сегодня местные власти Бобруйска посягнули на святая святых — нашу Память, запретив у Памятника жертвам политических репрессий поставить свечи, возложить цветы, провести панихиды священнослужителей, постоять в минуте молчания.

Кровью обливаются наши сердца, кровоточат годами не заживающие раны. Мы требуем:

— открыть архивы КГБ для ученых и общественных деятелей;

— прекратить издевательство над Куропатами;

— продолжить печатать в местных и республиканских газетах списки расстрелянных политрепрессированных;

— признать на государственном уровне день 30 октября — республиканским Днем политзаключенных;

— создать комиссии по делам репрессированных при президенте и высшем законодательном органе власти Республики Беларусь;

— вернуть отнятые льготы;

— создать Республиканский музей Памяти и Скорби;

— признать детей, находившихся в приемниках-распределителях НКВД, жертвами политических репрессий с доплатой минимальной зарплаты к пенсии;

— прекратить травлю и преследование общественных лидеров организаций жертв политических репрессий

— издать за государственный счет книгу "Память и Скорбь".

Документ подписали 323 человека.

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.
Фото В. ШАРНИКОВА.

Независимая экспертиза

Борис ЖЕЛИБА,
доктор экономических наук, профессор.

Мы платим невидимый, но страшно большой налог

Экономисты знают, что инфляционный налог — самый собираемый. Наши правительство и Национальный банк весьма преуспели в его собираемости.

По данным официальной статистики, индекс потребительских цен за сентябрь составил 117,6 процента. Это — официальные темпы инфляции. Граждане могут ощутить их в магазинах, глядя на цены, и заметить даже, что темпы инфляции занижены. Более точный показатель инфляции — темпы роста курса доллара. За прошлый, 1997 год, они составили без малого 100%, или 8,3% в месяц. В текущем году они выльются в существенно больший процент. Достаточно сравнить рыночный курс наличного доллара начала года с настоящим, который взлетел к середине октября до 180 тысяч рублей. Эти темпы инфляции вполне точно показывают, сколько лишних, т.е. необеспеченных ни золотовалютными резервами, ни товарной массой, денег вливается в экономику. Если среднемесячная зарплата по республике достигла 5 млн. руб., то в долларовом эквиваленте она будет всего 28—30 условных единиц. Напомним, что в 1995 году средняя зарплата достигала 70—80 долларов. Вот и прикиньте, на сколько обобрали граждан с помощью инфляции.

Как же избавиться от нее? Если вам повезло на свободные деньги и вы решили, как в былые времена, поместить их в банк под проценты, чтобы приумножить, то сегодня об этом не помышляйте. Всем очевидно, что "зайчик" давно утратил функцию накопления. Банки беспомощны защитить от инфляции ни сбережения населения, ни накопления предприятий, ни свои ресурсы, поскольку кредитные процентные ставки также перекрываются темпами галопирующей инфляции. Есть, пожалуй, единственный способ обороны: конвертировать отечественную валюту в твердую. Насколько это трудно сделать, а порою невозможно, не преступив закон, население хорошо знает.

Где же раздобыть доллары для уплаты таможенной пошлины за ввозимые иномарки, на приобретение турпутевок? А тут еще грозятся открыть валютные отделы в магазинах. Беззастенчиво толкая граждан на незаконные валютные операции, государство и таким путем стремится привлечь доллары в экономический оборот. Обменные пункты банков пусты из-за неприемлемого курса, а валютные вклады населения застыли на отметке 160—180 миллионов долларов из тех по меньшей мере 2 миллиарда, которые, как предполагают, находятся в чулках и в банках, но стеклянных. Также практически невозможно приобрести безналичные доллары и юридическим лицам. Последним есть еще возможность купить государственные краткосрочные облигации, но их доходность тоже существенно ниже темпов инфляции. Таким образом, что население, что предприятия не имеют возможностей не то что приумножить, а сохранить от всепроникающей инфляции свои сбережения и свободные средства. Это и есть на практике отрицательная политика властей в экономике. Все мы в подавляющем большинстве платим нигде не зафиксированный на бумаге невидимый, но ощутимый на кошельке инфляционный налог, результат чего — падение реальной зарплаты и обесценивание сбережений, снижение жизненного уровня населения.

Для того чтобы выйти на нормальную положительную процентную политику, нужно остановить необеспеченную кредитную эмиссию безналичных денег и печатание таких же наличных. Казалось бы, чего проще. Но оценивая глубину инфляционной ямы, в которой находится белорусская экономика, приходишь к выводу: чтобы остановить молох инфляции, потребуются неординарные меры, подкрепленные иной политической волей и высоким профессионализмом макроэкономистов.

Страна же продолжает идти иным путем, и мы становимся свидетелями того, о чем предупреждали здравые экономисты-аналитики. Инфляция подпитывает сама себя, раскручивается инфляционная спираль. Многие инструменты влияния на денежную массу со стороны Нацбанка утрачены. У него нулевые золотовалютные резервы, и их в обозримом будущем не накопишь, чтобы хоть как-то влиять на обменный курс белорусского рубля. Нет надежд не то что избавиться от отрицательного сальдо торгового баланса, которое оплачивается твердой валютой, но даже уменьшить его. Страна не может жить без импорта, не говоря уже о критическом импорте — лекарства, энергоносители и т.д. Основные фонды экспортеров — главных добытчиков валюты — изношены, импорт современных технологий невозможен: мы — в международной изоляции. И остановить инфляцию в существующей политической и экономической системе невозможно.

У медиков известен такой термин — паллиативная медицина (лат. pallire — прикрывать). Когда к безнадежному больному применяются лишь половинчатые меры, способные несколько продлить ему жизнь и облегчить страдания. Мрачно, но наша экономика живет на финансовых инфляционных инъекциях. Это — паллиативная экономика. Надо ли быть большим экономистом, чтобы предвидеть, каким может быть конец?

Ці сустрэнем мы Новы год з шампанскім і цукеркамі?

Прылаўкі з прысмакамі апошнім часам прыкметна збяднелі, і дэфіцыт айчынных шакаладных цукерак набыў, відаць, зацяжны характар. Па меры набліжэння навагодніх свят такая сітуацыя хвалюе ўсё большую колькасць жыхароў нашай краіны. Як паведамілі карэспандэнту БелТА ў канцэрне "Белхарчпрам", запасаў сыравіны для вытворчасці цукерак на мінскай "Камунарцы", на жаль, малавата, як, дарэчы, і на гомельскай фабрыцы "Спартак". Хоць апошняя, на думку спецыялістаў, знаходзіцца сёння ў крыху лепшым становішчы.

Ёсць прычыны для хвалявання і ў вытворцаў шампанскага. На Мінскім заводзе шампанскіх він сыравіны для яго вытворчасці з кожным днём становіцца ўсё менш. Аднак прадпрыемства працуе, а гандаль стварае запасы гэтага папулярнага пад Новы год пеністага напітку. Разам з тым у "Белхарчпраме" запэўнілі, што святочны настрой жыхарам Беларусі не сапсуюць. Цяпер у аператыўным парадку прымаюцца меры па завозу неабходнай сыравіны для вытворчасці цукерак і шампанскага з-за межаў краіны. Праўда, сітуацыя крыху ўскладняецца розным курсам беларускага рубля ў адносінах да долара, а таксама дэфіцытам самой валюты.

Алег ШВЕДАЎ, БелТА.

Эхо скандала

"Как князь, он желал иметь рядом своих приближенных"

В прессе промелькнула информация, что президент Республики Беларусь А.Лукашенко предложил турецкому послу Ш.Сойсал вернуться в Дрозды, откуда несколько месяцев назад ее и дипломатов ряда других стран ультимативно заставили выселиться. Более того, белорусская сторона якобы даже согласна взять на себя все издержки, связанные с реконструкцией резиденции турецкого посла.

Не будем гадать, как воспримут жест Минска в Стамбуле. Но обозреватели схожи в одной мысли: в самом начале конфликта причина была не в том, что Дроздам грозила экологическая катастрофа. Просто белорусский президент не хотел, чтобы там жили послы. "Как князь, он желал иметь рядом своих приближенных", — заметил один маститый комментатор.

В принципе, такая позиция вполне приемлема. Это его законное право решать, кто у него должен быть соседом. Но в таком случае нельзя *свое* право противопоставлять *международному* праву, праву дипломатов, которые приехали работать в нашу страну. Есть Венская конвенция — основной закон международных отношений, — и с ее нормами следует считаться. С ней детские игры проводить нельзя, тем более — главе государства. Венская конвенция, являясь документом международного права, — выше права любой отдельной страны, она является международной, и послы находятся под ее защитой.

С другой стороны, президенту А.Лукашенко можно было, не нарушая положения Венской конвенции, спокойно решить вопрос, касающийся местонахождения резиденций послов. Хотя заключены договоры, которые, по большому счету, должны соблюдаться, но дипломаты могли бы пойти навстречу белорусским властям, если бы вопрос решался не в ультимативном порядке. Большинство стран готовы были с самого начала вести разговор о том, чтобы покинуть Дрозды, не ожидая истечения срока договора об аренде. Просто одним понадобилось бы на переезд несколько недель, другим — несколько месяцев.

Но белорусский президент, судя по всему, сознательно пошел на конфликт, выставив ультимативные сроки выселения послов со своих резиденций в Дроздах. И тогда послы заявили: под давлением вести переговоры бесперспективно. Господин Лукашенко должен понимать: во всем цивилизованном мире уничижительное отношение к послам рассматривается как уничижительное отношение к главам их государств.

Таким образом, все, что было предпринято со стороны европейских стран, — это должная реакция на бессмысленные действия президента А.Лукашенко, на нарушение им положений Венской конвенции. Белорусские власти могли ожидать и более жестких мер, чем отказ в визах высокопоставленным чиновникам.

При любом удобном случае зарубежные дипломаты подчеркивают, что их страны всегда готовы поддерживать хорошие отношения с Беларусью. Исходя из этого, определенные лица, проявив благоразумие, и вынесли на рассмотрение белорусской стороны встречные предложения. При этом договорились: пока ведутся переговоры, никакой информации в прессу не давать. Но 17 сентября, проводя брифинг, господин Антонович заявил: "Послы хотят сохранить свои лица". Такие заявления — это вовсе не шуточки, как кое-кто думает. Непродуманное высказывание Антоновича прибавило головной боли белорусской стороне.

В официальной прессе подается информация, будто Минск готов исчерпать конфликт, предложив послам на выбор другие резиденции. Якобы представлен большой список их с указанием места расположения, другой подробной информацией. Сообщено и о том, что большую часть их осмотрел лично президент А.Лукашенко. Во-первых, в обязанности главы государства не входят функции маклеров, а во-вторых, тот "раздутый" список также вызывает ряд вопросов и не решает проблемы. В этом списке, как нам стало известно, имеется ряд неточностей.

Похоже, посольский скандал, разразившийся не без усилий лично А.Лукашенко, не так просто погасить. Недавно в столицу Беларуси прилетал эмиссар Европейского Союза. О результатах переговоров пока говорить рано. Если верить информации некоторых источников, то серьезных подвижек в разрешении конфликта нет. Позиция Европы в отношении Лукашенко неизменна: он должен уважать международное право. Без выполнения условий, предъявленных белорусскому президенту рядом европейских государств, западные послы не могут вернуться в Минск. Пресс-секретарь Госдепартамента США Фоули заявил, что американский посол "не вернется обратно, пока не будет гарантий, что его права будут восстановлены".

До 1994 года Запад не знал Лукашенко и у него к нему не было никаких предубеждений. А потому все, что последовало за прошедшее время со стороны Запада, — это ответная реакция на действия Лукашенко. Для стран с развитой демократией неважно, где будут жить послы — в Дроздах или в другом месте. Для них важно соблюдение международных договоренностей, цивилизованных методов решения возникающих конфликтов.

Антон КОРЗУН.

Названы пераможцы конкурсу маладых выканаца міжнароднага фестывалю "Залаты шлягер"

Журы конкурсу маладых выканаца, што прайшо у рамках Міжнароднага фестывалю "Залаты шлягер" (Магілё), назвала імёны пераможца.

Гран-пры атрыма Жэлью Йоксімавіч (Югаславія), які выкана песню Н.Багаслоскага "Тры гады ты мне снілася" і народную чарнагорскую песню "Яшчэ не раніца". Першую прэмію падзялілі Ірына Дарафеева (Беларусь) і Вольга Сяргеева (Расія). Уладальнікамі другой прэміі сталі Леся Навіцкая (Украіна), Саід Яг'я (Узбекістан) і Аляксандр Зявровіч (Беларусь). Два выканацы — Яніца Маркава (Балгарыя) і Леанід Балкін (Латвія) — падзялілі трэцюю прэмію. Спецыяльны прыз журы — за абаяльнасць і артыстызм, а таксама прыз глядацкіх сімпатый прысуджаны выхаванцам удзельніка "Залатога шлягера" — спевака Мансура Ташматава — соул-квартэту "Сідэрыз" з Узбекістана.

Марыя ПЯТРОВА.

Народная Воля

10 ЛІСТАПАДА 1998 г.

Далёкае — блізкае

Антон КАРПІЦКІ

Кароткая хроніка памяці ад Суслава да Хахлова з Дамарадам,

альбо Ад замаразкаў — да дзікай халадэчы

Напрыканцы 70-х гадоў П.М.Машэраву прыходзіць ідэя ўвекавечыць ахвяры апошняй вайны "от младенца до старца". "Прыдумаць" жанр шматтомнага выдання даручаецца намесніку галоўнага рэдактара выдавецтва БелСЭ, пісьменніку Алесю Петрашкевічу. "Прыдумваючы" жанр, той вывучае сітуацыю з ахвярамі і прыходзіць да высновы, што іх на Беларусі каля [illegible] мільёнаў: 2 мільёны 200 тысяч мірных жыхароў, мільён мужчын, што не вярнуліся з вайны і каля мільёна васьмісот тысяч воінаў Чырвонай Арміі, якія загінулі на беларускай зямлі. Калі запісаць у памятных кнігах толькі прозвішча, імя і імя па бацьку кожнага, то спатрэбіцца выдаць не менш за сто кніг аб'ёмам у 60 аўтарскіх аркушаў кожная.

Вядома, не ўсе прозвішчы ахвяр будуць знойдзены, асабліва мірных жыхароў і савецкіх ваеннапалонных — пасля вайны ўжо мінулі дзесяцігоддзі. І тым не менш... [illegible] тэлефонных даведнікаў на той свет? Ці ж такіх кніг [illegible] ахвяры вайны і іх сваякі? Ці ж на канторскіх кнігах будуць выхоўвацца будучыя пакаленні? А ці не запатрабуюць яны праўдзівых, чэсных, эмацыянальных звестак пра герояў і трагізм сваіх суродзічаў? Логіка [illegible] падказвалі неабходнасць прыблізіць кнігі да чытача, зрабіць іх такімі, каб яны сталі і падручнікамі па гісторыі Радзімы, і сямейнымі мемарыяламі. Паўстала, праўда, адно пытанне: а чаму яны павінны асвятляць толькі гераізм і трагедыю народа выключна падчас Вялікай Айчыннай вайны? Хіба наш народ прайшоў толькі праз гэта пекла?..

Стваральнік канцэпцыі выдання спыняецца на традыцыйным для Беларусі жанры хронікі, маючы на ўвазе, што яна будзе [illegible] эмацыянальнай. 140-томнае серыйнае выданне (кожнаму гораду і раёну па кнізе, а абласным цэнтрам па 2—3) [illegible] як гісторыка-дакументальная Хроніка Памяці Беларусі. Распрацоўваецца структура выдання і яго мастацка-тэхнічнае афармленне. У галоўнай рэдакцыі БелСЭ ствараецца спецыяльная рэдакцыя хронік. На адказную справу адмабілізоўваюцца вучоныя, пісьменнікі і журналісты. [illegible]

І раптам званок з "Савецкай энцыклапедыі", якому БелСЭ падпарадкоўвалася на правах "маленькай сястры": "Хроники Памяти в издание не планировать, поскольку они не воспринимаются наверху", гэта значыць у агітпропе ЦК КПСС. [illegible] сакратар па ідэалогіі ЦК КПБ А.Т.Кузьмін [illegible] Міхаіл Васільевіч [illegible]

[illegible] мільёнаў загубленых жыццяў толькі ў Беларусі, калі афіцыйная лічба ўсіх людскіх страт СССР у Вялікай Айчыннай вайне афіцыйна вызначана толькі ў сем мільёнаў.

Гэта ўжо пасля будзе названа лічба ў 10, потым у 20, потым у 27 мільёнаў. А ў нашы дні вядомы даследчык Валкагонаў назаве лічбу людскіх страт недзе ў прамежку паміж 40 і 50 мільёнамі.

У патавай сітуацыі П.М.Машэраў паступае не толькі мудра, але і мужна. Ён раіць галоўнаму рэдактару БелСЭ Пятрусю Броўку рэдакцыю Хронік Памяці ліквідаваць, а рукапісы... рабіць, паколькі яны не гараць. На працягу некалькіх гадоў рукапісы Хронік робяцца, можна сказаць, падпольна.

З падполля стваральнікі Хронік выходзяць толькі пасля таго, як шэры кардынал і яго верны зброеносец пакідаюць гэты свет. Адразу ж за Шуміліным у свет выходзяць хронікі Талачынскага, Бярозаўскага, Ляхавіцкага, Быхаўскага, Гродзенскага і Пружанскага раёнаў. Адначасова вядзецца работа па стварэнні рукапісаў Хронік іншых раёнаў. Куратару Хронік Петрашкевічу ўдаецца стварыць працаздольны калектыў энтузіястаў на чале з Георгіем Кісялёвым, які "абрастае" шырокім актывам прафесійных гісторыкаў і краязнаўцаў-аматараў.

Чытачы радуе кожная новая кніжка, хоць яны яшчэ недасканалыя [illegible] у асноўным гераічныя падзеі вайны. Але жыццё не стаіць на месцы. [illegible] больш высокі, больш сталы навуковы ўзровень Хронік.

Спадзяванні не здзяйсняюцца. Гарбачоўская перабудова [illegible] беларускую Вандэю. Ёй не да "Памяці". Крызісныя з'явы ў выдавецтве БелСЭ [illegible] І.Шамякіна, які прыйшоў у энцыклапедычнае выдавецтва пасля смерці Броўкі, на думку пазбавіцца ад шматтомнага стратнага выдання. Петрашкевіч пратэстуе супраць [illegible] галоўнага рэдактара і знаходзіць пэўную падтрымку ў "верхах". Тады галоўны рэдактар [illegible] ад "Памяці" разам з Петрашкевічам, скараціўшы пасаду свайго намесніка пад выглядам таго, што зарплата з-пад скарачанай стаўкі будзе падзелена паміж загадчыкамі галіновых рэдакцый БелСЭ. Загадчыкі, вядома ж, падтрымліваюць шэфа, а ён аднаўляе скарочаную стаўку і прызначае сабе новага, паслухмянага намесніка.

Іван Пятровіч застаецца верным сабе, хоць і без "Памяці". [illegible] праект пастановы Савета Міністраў аб выданні гісторыка-дакументальных Хронік Памяці як урадавага выдання. Старшыня Савета Міністраў БССР В.Ф.Кебіч падпісвае пастанову [illegible] Шамякіным. Больш за тое, пастанова [illegible] выдавецтву БелСЭ выпускаць у год па дзесяць Хронік. [illegible] У адпаведнасці з пастановай старшыня Дзяржкамдруку [illegible] стварае пры Дзяржкамітэце арганізацыйна-метадычны цэнтр па выданню гісторыка-дакументальных Хронік Памяці. Яго ўзначальвае [illegible] заслужаны работнік культуры Беларусі [illegible] Алесь Петрашкевіч. Памочнікамі Петрашкевіча становяцца доктар і два кандыдаты гістарычных навук, а таксама два выдатныя філолагі. Першыя трое — спецыялісты па крыніцазнаўству, архівазнаўству, ваеннай і партызанскай гісторыі, два іншыя — [illegible] Годныя кадры і спрыяльная на першых парах сітуацыя ў краіне садзейнічаюць [illegible] удакладненне канцэпцыі выдання. [illegible]

Дапрацаваная, удакладненая канцэпцыя Хронік Памяці абмяркоўваецца і ўхваляецца навукова-практычнай канферэнцыяй, у якой прымаюць удзел [illegible] гуманітарныя інстытуты Акадэміі навук Беларусі [illegible] Нацыянальнага навукова-асветніцкага цэнтра імя Ф.Скарыны і старшыні абласных, гарадскіх і раённых камісій па падрыхтоўцы рукапісаў Хронік Памяці, якія [illegible] ствараюцца пасля зачыненых гаркамаў і райкамаў КПБ.

Справа, нарэшце, зрушваецца, але не на столькі, каб задаволіць няўрымслівых ветэранаў. Яны з нажом каля горла патрабуюць выдаць за год, да 50-гадовага юбілею Перамогі, больш за 100 кніжак. У пісьме на імя прэзідэнта супраць Хронік у іх сённяшнім выглядзе выступае старшыня Саюза афіцэраў Брэста. Падавай яму Хронікі толькі ў выглядзе спісаў загінуўшых і зноў жа да чарговага юбілею.

Не паспяваюць выдаўцы адбіцца ад бравага палкоўніка, як не менш бравы генерал-лейтэнант з рэспубліканскага Савета ветэранаў піша ў Кабінет міністраў, што жанр, канцэпцыю і структуру Хронік трэба змяніць, пакінуўшы ў іх толькі спісы страт асабовага складу Чырвонай Арміі, як гэта робіцца ў Расіі. Кіраўнік арганізацыйна-метадычнага цэнтра сустракаецца з генерал-лейтэнантам, дэманструе яму свае Хронікі і расійскія "Книги Памяти" ў выглядзе тэлефонных даведнікаў без нумароў абанентаў; трымае паўтарагадзінны маналог па гісторыі Беларусі, каб той не толькі зразумеў сэнс беларускіх Хронік Памяці і іх выгаднае адрозненне ад расійскіх (сваіх ён да гэтага ў вочы не бачыў), але і адазваў бы з Кабінета міністраў свой недарэчны ліст, які яму, як высветлілася, падсунулі на подпіс тыя самыя ветэраны. І дзякуй Богу, генерал-лейтэнант пагаджаецца і ліст свой адклікае.

Не паспявае мінуць гэта напасць, як утвараецца Камітэт па справах абароны правоў ваеннаслужачых, а часова выконваючы абавязкі старшыні камітэта і таксама генерал адразу ж вырашае прычыніцца да выдання Хронік Памяці. Збірае сваіх падначаленых палкоўнікаў-палітработнікаў у адстаўцы і дае вычарпальную і простую ўстаноўку раз'ехацца па гарадах і вёсках рэспублікі і правесці інструктаж гарадскіх і раённых камісій па падрыхтоўцы рукапісаў Хронік Памяці на той конт, што Камітэту па абароне правоў ваеннаслужачых "не нужно Княжество Литовское, а тем более Речь Посполитая и списки реабилитированных. Пусть они издадут только списки погибших воинов к юбилею Победы".

І палкоўнікі раз'язджаюцца, даюць устаноўку, чым канчаткова заблытваюць членаў гарадскіх і раённых камісій, пасля чаго тыя наогул перастаюць нешта рабіць, бо лічаць выданне толькі спісаў глупствам і прафанацыяй. Супрацоўнікаў жа арганізацыйна-метадычнага цэнтра Дзяржкамдруку бойкі генерал выклікае на пасяджэнне свайго Камітэта, каб прызнаць работу Цэнтра нездавальняючай, але, атрымаўшы па зубах ад радавых дактароў і кандыдатаў, адолець іх не можа, хоць паскудзіць штодзень і з каляіны выбівае канчаткова.

Цяжка сказаць, як бы развіваўся канфлікт паміж Камітэтамі, калі б Камітэт па ахове правоў ваеннаслужачых не загадаў доўга жыць і сам ціха сканаў, як і той шэры кардынал.

Хранікёры-летапісцы з палёгкай уздыхаюць і думаюць, што на гэтым іх барацьба з ветранымі млынамі, а дакладней, з армейскімі пустамелямі скончылася. Але дзе вы бачылі? Знаходзіцца дзівак у родным Дзяржкамітэце Рэспублікі Беларусь па друку пад асацыятыўным прозвішчам Жарыкаў, якім авалодвае непераадольная слабасць у жаданні неяк засвяціцца перад новым старшынёй камітэта У.П.Замяталіным і абірае для гэтай мэты, як і яго папярэднікі, ідэю змяніць канцэпцыю, дух і форму ўсё той жа Хронікі Памяці Беларусі, каб яна ні пра што больш не апавядала, акрамя подзвігу беларускага народа ў Вялікую Айчынную вайну. З гэтай прымітыўнай прапановай ён і раз, і другі, і трэці бяжыць да Уладзіміра Пятровіча. А той слухае ініцыятыўнага начальніка ўпраўлення, але ніякай ацэнкі яго "служебному усердию" не дае. І нецярплівы ініцыятар не вытрымлівае. За плячыма ў старшыні Дзяржкамітэта і кіраўніка арганізацыйна-метадычнага цэнтра абвяшчае старшыням гарадскіх і раённых камісій, што з 1 студзеня 1998 года ў Беларусі, як і ў Расіі, будуць выпускацца не гісторыка-дакументальныя Хронікі Памяці, а ўсё тыя ж голыя спісы ахвяр вайны з пэўнымі каментарыямі.

Голыя дык голыя! Нарэшце не вытрымліваюць старшыні аблвыканкамаў і зліквідоўваюць абласныя арганізацыйна-метадычныя цэнтры ў Брэсце, Віцебску, Гродне і Мінску, бо спісы ў гарадах і раёнах ужо не толькі падрыхтаваны, але і надрукаваны ў мясцовым друку. Праца над рукапісамі ў гарадах і раёнах названых абласцей фактычна спыняецца. Тады Петрашкевіч звяртаецца з цыркулярным лістом да ста старшынь раённых і гарадскіх камісій па падрыхтоўцы рукапісаў Хронік з запытам, якія кнігі пра свае родныя гарады і раёны яны хацелі б мець. Адначасова просіць старшынь накіроўваць свае пісьмовыя меркаванні старшыні Дзяржкамдруку У.П.Замяталіну, а яму, Петрашкевічу, дасылаць толькі копіі, бо баіцца, што арыгіналы яму могуць і не паказаць.

Старшыні і намеснікі старшыняў гарадскіх і раённых выканкамаў адгукваюцца даволі дружна і аператыўна. Меркаванні іх адназначныя: настаўнікам, вучням, іх бацькам, тым жа ветэранам трэба грунтоўныя рэгіянальныя гістарычныя энцыклапедыі пра ўсе эпохі, перыяды, важнейшыя падзеі ў іх гарадах і раёнах. Амаль кожны з аўтараў тых лістоў просіць У.П.Замяталіна вызначыцца нарэшце з гэтымі Хронікамі і спыніць калатэчу, бо на падрыхтоўку рукапісаў затрачана не толькі шмат грошай, сабраных на святую справу ў працоўных калектывах, але і чалавечых нерваў.

У некаторых кіраўнікоў раёнаў нервы сапраўды здаюць, бо на чыноўную дурасць сапраўды цяжка рэагаваць, каб не выйсці за рамкі службовага этыкету. І В.Мацвеенка з Кармы піша У.П.Замяталіну: "Выключэнне з кнігі перыядаў ад археалогіі да Вялікай Айчыннай вайны прывядзе да перарыву гістарычнай памяці, цэласнасці і паслядоўнасці нашага мінулага. Няўжо мы ўсе так "оскудели умом", што наша памяць аб сваім мінулым помніць толькі з 1941 года". "Пры змене канцэпцыі, жанру і формы кніг будзе абясцэнена сама ідэя выдання, што выкліча справядлівае абурэнне грамадскасці", — піша А.Старацітараў з Добруша. Намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама ў сваім лісце просіць старшыню Дзяржкамвыда "дапамагчы... давесці пачатую святую справу да завяршэння, каб марна не згубілася праца тысяч людзей, а сённяшнія і будучыя пакаленні мелі б унікальную магчымасць ведаць сапраўдную, праўдзівую гісторыю сваёй Радзімы". Абураны А.Жукоўскі з Клецка даслаў ліст, які сведчыць пра адукаванасць, высокую інтэлігентнасць многіх кіраўнікоў нашых гарадоў і раёнаў. (Разам з такімі людзьмі ўжо можна змагацца з чыноўнай абмежаванасцю.) "Я лічу, — піша спадар Жукоўскі, — што, як пяецца ў рускай песні, "лучше уж никак вместо как-нибудь". Так, раздзел пра Вялікую Айчынную вайну вельмі важны, але ён ахоплівае толькі маленькую частку нашай гісторыі. А хіба не маюць цікавасці для нас і будучых пакаленняў звесткі аб тым, як жылі нашы продкі ў далёкім мінулым? Нельга выкінуць з гісторыі і Кастрычніцкую рэвалюцыю, і грамадзянскую вайну, і калектывізацыю, і рэпрэсіі... Толькі чыноўнік з чэрствай душой можа прыдумаць ідэю выпусціць замест гісторыка-дакументальнай Хронікі Памяці нейкі маленькі фрагменцік гісторыі".

Каб неяк застрахавацца ад нечаканасцяў і ўратаваць выданне ад згубы, Петрашкевіч звяртаецца ў Пастаянную камісію па адукацыі, культуры і навукова-тэхнічным прагрэсе Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь з просьбай вывучыць сітуацыю, дапамагчы неардынарнай справе і арганізацыйна, і фінансамі. Становішча з выданнем Хронік асабіста вывучае намеснік старшыні Пастаяннай камісіі дэпутат Н.Шаўцоў і піша на імя прэзідэнта рэспублікі талковую запіску, у якой прапануе прыняць спецыяльны ўказ "О мерах по завершению подготовки и изданию историко-документальных Хроник Памяти".

Прэзідэнт накіроўвае запіску дэпутата Н.Шаўцова У.П.Замяталіну (цяпер ужо намесніку старшыні Савета міністраў), а той закідвае яе ў доўгую шуфляду, дзе яна і пыліцца з лістапада мінулага года. А тым часам вядомыя ў сталіцы састарэлыя рэтраграды і дагматыкі ад гістарычнай навукі, што да гэтага часу спавядаюць сумнай памяці Лаўрэнція Абэцэдарскага і Лаўрэнція Берыю, А.Г.Хахлоў і К.І.Дамарад пішуць у Дзяржкамітэт па друку аблыжны данос "О фальсификаторских тенденциях в работе организационно-методического центра по изданию историко-документальных хроник Память", у якім, у прыватнасці, адзначаюць, што "исключительно отрицательное влияние на идейно-политический характер хроник "Память" оказал контрреволюционный переворот, совершенный в октябре 1991 г.". З гэтае прычыны артадоксы сталінска-бальшавіцкай гістарычнай школы патрабуюць прама па Салтыкову-Шчадрыну: метадычны цэнтр ліквідаваць, а яго кіраўніка ад выдання Хронік адхіліць. Петрашкевіч жартуе: дзякуй, маўляў, даносчыкам за гуманнасць, а то маглі б запатрабаваць і прысуду да вышэйшай меры пакарання, як у 37-м годзе.

Трэба аддаць належнае намесніку старшыні Дзяржкамдруку С.А.Нічыпаровічу. У сваім пісьме ён даў абгрунтаваны адлуп паклёпнікам, у прыватнасці, адзначыўшы, што "руководитель методцентра А.Л.Петрашкевич (образованный историк и литератор, опытный организатор энциклопедического дела в республике, что в свое время было отмечено Государственной премией Беларуси) в принципиальных, научных спорах о подаче того или иного материала в Хрониках отдает предпочтение коллективному мнению академических гуманитарных институтов и научным исследованиям, а не мнениям отдельных ученых-историков, имеющих либо свои личные взгляды на отдельные исторические события, либо связанных дисциплиной своих политических организаций, партий и фронтов, которых сейчас в Беларуси зарегистрировано, как известно, свыше сорока".

Гэта, вядома ж, сталася не па носе паклёпнікам, і яны цяпер ужо накляпалі на Нічыпаровіча і не куды-небудзь, а на самы самейшы ўладны алімп. Акрамя гэтага абмеркавалі ідэйна-палітычную годнасць хронік у Мінскім камуністычным гаркоме партыі, пасля чаго заціяты сталінска-берыеўскі апалагет і састарэлы прафесар Залескі праз свайго суседа перадае Петрашкевічу, што яго дні ўжо злічаны. І сапраўды, партыйна-савецкая машына спрацавала бездакорна. Без чытання і рэцэнзавання 47 Хронік Памяці, якія ўжо выйшлі ў свет, без азнаямлення з 53 рукапісамі, што на сёння рэкамендаваны метадычным цэнтрам да друку, бравыя алімпійцы неадкладна даюць Дзяржкамдруку каманду: "контррэвалюцыянера" Петрашкевіча з пасады кіраўніка метадцэнтра зняць, але не за "контррэвалюцыю", якую ў Хроніках падмецілі цвёрдакаменныя чэкісты-ленінцы, а па прычыне пенсійнага ўзросту. Гэтакая, бачыце, далікатнасць дэмакратычных улад. А маглі б і адразу ў Курапаты, па жоўтым пясочку. Дарога ж накатаная.

Трэцяга жніўня бягучага года С.А.Нічыпаровіч, засмучаючыся і чырванеючы ад сораму за сябе і за алімпійцаў, зачытвае ў калектыве метадцэнтра загад старшыні Дзяржкамдруку М.В.Падгайнага аб вызваленні ад пасады пенсіянера Петрашкевіча і прызначэнні на гэтую ж пасаду іншага пенсіянера (відаць, не контррэвалюцыянера).

...Не, не выпадкова ў нашых судзілішчах жыўцом паляць сябе людзі — паляць ад беззаконня, крыўды, знявагі, хамства і беспардоннага цынізму нахабнікаў і невукаў, што сядзяць на "гарызанталях" і "вертыкалях". Але ж калі кожны абражаны пойдзе на самаспаленне, у нас загіне не кожны трэці, як у вайну, а бадай, кожны другі, а ўлады здзічэюць канчаткова. Так што ёсць рэзон пакуль пажыць ахвярам беларускай "дэмакратыі" ды падзівіцца на "белорусское чудо" і на тое, да чаго давядзе нашу гаротную краіну ўсеагульны, усеахопны халуяж ніжэй ляжачых перад вышэй сядзячымі...

Ад рэдакцыі

Чытачы, мабыць, заўважылі: у гэтай публікацыі адной з галоўных дзеючых асоб з'яўляецца вядомы беларускі драматург і гісторык, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі, асноўны арганізатар энцыклапедычнай справы на Беларусі Алесь Петрашкевіч. Ён жа, як вы памятаеце, быў і аўтарам вострага і актуальнага артыкула "Хто каму донар і хто ў каго дояр?" (4.09.98 г.), у якім, дарэчы, аўтар, уступіўшы ў палеміку са знакамітым расійскім пісьменнікам В.Распуціным, адкрыта разважаў пра тое, хто каго на працягу вякоў рабаваў — каланіяльная Беларусь імперскую Расію ці наадварот.

Пацікавіўшыся сённяшнім лёсам А.Петрашкевіча, мы здзівіліся: аказваецца, прафесійны літаратар, гісторык такога ўзроўню не патрэбны дзяржаве і звольнены з пасады фактычна па палітычных матывах, бо спавядае гістарычную праўду, не прымае прафанацыі і фальсіфікацыі ў навуцы, кіруецца не кан'юнктурай рэтраградаў, а сумленнем і аб'ектыўнасцю, адказнасцю перад часам і Радзімай, выратаванне якой у нацыянальным Адраджэнні.

"Народная воля" гатова і ў далейшым прадастаўляць свае старонкі вядомаму беларускаму драматургу і гісторыку Алесю Петрашкевічу для адкрытага выказвання сваіх прынцыповых і шчырых меркаванняў па пытаннях, якія хвалююць грамадства!

12—13 лістапада чакаецца рабочы візіт у Беларусь спікера расійскай Дзярждумы Г.Селязнёва

Як стала вядома БелаПАН, 12—13 лістапада старшыня Дзяржаўнай думы Расійскай Федэрацыі Генадзь Селязнёў наведае Беларусь з рабочым візітам. Спікер Дзярждумы мае намер сустрэцца з прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам і прадстаўнікамі так званага Нацыянальнага сходу.

Максім ЦІТОЎ.

Іконы вывезці за мяжу не ўдалося

Спробу вывазу за мяжу яшчэ адной вялікай партыі царкоўных каштоўнасцей прадухілілі брэсцкія пагранічнікі. На пагранпераходзе "Казловічы" ў грузавым аўтамабілі, якім кіраваў грамадзянін Чэхіі, яны знайшлі 32 старадаўнія іконы і два чатырохстворкавыя складныя абразы. Знаходзілася гэта кантрабанда сярод задэкларыраванай партыі адзення. Сваё дачыненне да затрыманых царкоўных рэчаў чэшскі вадзіцель адмаўляе. А іконы і абразы перададзены спецыялістам для ацэнкі.

Іван КУКСА.

Что там, в Литве ?

Пьющие и курящие будут спасать культуру

Сейм Литвы принял закон о Фонде культуры и спорта. Согласно ему, 2 процента от акцизных поступлений в результате продажи алкогольных напитков и табачных изделий будет напрямую, минуя госбюджет, поступать в фонд.

Впрочем, есть и противники такого способа финансирования культуры. Они утверждают, что деятели искусства и работники культуры перестанут бороться за трезвый и здоровый образ жизни, ибо их судьба будет напрямую зависеть от количества пьющих и курящих. В этой ситуации даже президент Валдас Адамкус решил остаться в стороне. Он, якобы из-за занятости и зарубежных визитов, не успел в установленный срок хорошо изучить закон и его подписать. Сделать это за президента пришлось председателю Сейма Витаутасу Ландсбергису.

Не без основания теперь многие литовцы утверждают, что не правительство, а пьющие и курящие будут спасать культуру и искусство Литвы.

Лит останется "твердым" и в 1999 году

Премьер Литвы Гедиминас Вагнорюс сообщил, что правительство решило не отказываться в 1999 году от валютного управления и курс лита по отношению к доллару не изменится. Такое решение принято в связи с кризисом в России. Как известно, раньше было обещано в 1999 году начать постепенный переход к более свободному курсу лита.

Альгимантас БРАЗАЙТИС.

Взгляните на этот снимок и скажите: "Предотвратим очередную атомную катастрофу!"

Спасибо за то, что "Народная воля" постоянно уделяет внимание очень важному вопросу — целесообразности развития атомной энергетики в Беларуси. На страницах газеты не раз поднималась проблема, связанная с тем, что кое-кто спит и видит Беларусь в кольце атомных станций.

Хочу внести свой скромный вклад в дело предотвращения этой безумной затеи.

По роду своих служебных обязанностей мне приходится бывать в загрязненных радионуклидами районах Беларуси. В одной из командировок я сделал фото, которое прошу опубликовать в "Народной воле". На снимке изображено то, что осталось от деревни Беседь Ветковского района Гомельской области. Десятки вот таких брошенных жителями и разграбленных мародерами деревень появились на земле Беларуси после чернобыльской катастрофы. Быть может, вид этой современной Хатыни заставит задуматься о надвигающейся на всех нас беде — безумных планах строительства АЭС на засыпанной радиоактивным пеплом земле Беларуси.

С уважением — С.СТАРОБИНЕЦ,
старший научный сотрудник.

На снимке: *деревня Беседь Ветковского района Гомельской области.*

Бытовуха

Обыски и оскорбления — норма жизни?

Расскажу об инциденте, произошедшем со мной в столичном универсаме "Заводской".

Мне 63 года. Являюсь инвалидом 2-й группы. Обычно хожу за продуктами в этот универсам.

К тому, что проверяют сумки, то есть обыскивают при на выходе из магазина, мы уже привыкли. Но чтобы при входе в магазин обыскивали, проверяли сумки и сыпали оскорбления на голову покупателя — это что-то новое.

Именно это произошло со мной не так давно.

Захожу в магазин. Сумку с продуктами, взятыми в другом месте, сдала в гардероб. Направляюсь в торговый зал. И вдруг мужеподобного вида особа, стоящая на входе, хватает сумку, в которой у меня лежали лекарства, книжки для оплаты коммунальных услуг, очки и другие вещи, необходимые инвалиду и любой женщине при выходе из дома, и кричит на весь магазин, что такие большие сумки нельзя носить с собой.

Я пытаюсь объяснить, что это необходимые мне вещи и документы. Она же продолжает кричать, что я должна показать ей все документы и вещи.

В магазин я все-таки прошла и продукты взяла. Но на душе остался тяжелый и горький осадок. Разве ей дано право при входе в магазин обыскивать и оскорблять покупателей? Да и где тот свод законов и правил, в котором указано какого размера сумка нормальная, а какого — меньше или больше нормы?

Галина МАТЮШИНА,
Минск.

Письмо простого человека

Горький хлеб победы,

или О том, зачем заниматься производством молока, если цена на него ниже, чем на воду

По итогам нынешней уборочной страды Докшицкий район стал победителем республиканского соревнования. На фестивале "Дожинки-98" районное руководство получило почетный диплом, денежную премию в размере 150 миллионов рублей, автомобиль для служебного пользования. На этом же фестивале ценными подарками были отмечены сразу 8 лучших комбайнеров района, которые заняли первое, два вторых и третьи места в соперничестве по своим категориям машин.

Казалось бы, радоваться и только. Однако итог уборочной страды оказался безрадостным. Продали зерно, подсчитали выручку и... прослезились. Во-первых, пришлось отдавать кредиты, которые выделялись именно под этот урожай. Во-вторых, нужно было рассчитаться за горюче-смазочные материалы, которые также брались в долг. В-третьих, и своим же хлеборобам за ударную работу на жатве заплатить не помешало бы.

Ну, хорошо, заплатили. А что после всех этих выплат осталось? Ровным счетом ничего. Даже на оплату труда и то не хватило. По состоянию на 1 октября задолженность по зарплате по колхозам и совхозам района не за сентябрь даже, а за август составила 7 миллиардов 52 миллиона рублей. Нет сомнений в том, что к концу этого месяца она вырастет еще больше. Денег-то нету.

Зато долги все растут и растут. Общая кредиторская задолженность хозяйств агропрома составила уже 87 миллиардов 204 миллиона рублей. А дебиторская? Она намного меньше — 14 миллиардов 869 миллионов. Этот дисбаланс с каждым годом растет. Да и как не расти, если в сельском хозяйстве сейчас производство молока и мяса стало убыточным, а по производству зерна, как ясно из того, что сказано выше, едва-едва можно свести концы с концами? Как деревня может вылезти из долгов, если литр минеральной воды стоит намного больше, чем литр молока? Так может быть, и в самом деле перепрофилировать производство на эту минералку? Пробурить скважину и качать деньги?

Деревня, конечно, на это не пойдет. Но все же о чем думает наше "родное", отнюдь не царское правительство, загоняя ее в долговую яму?

Викентий КАРПОВИЧ,
житель г.Докшицы.

Они — о нас

Беларусь: лидер предлагает решение в советском стиле

"Файнэншл таймс" (Великобритания):

"Для его врагов президент Беларуси Александр Лукашенко является коммунистическим диктатором. Для его сторонников — а их миллионы — он служит большой надеждой бывшего Советского Союза.

С момента, когда он пришел к власти после стремительной победы на выборах 1994 года, Лукашенко ликвидировал реформы своего ориентированного на Запад предшественника, восстановил контроль над ценами, реинтегрируя экономику страны с российской, введя авторитарную конституцию и поддерживая тайную полицию.

Беларусь — одна из немногих стран в мире, где свежеокрашенные статуи Ленина украшают скверы. "Лукашенко одержим страстью к неограниченной личной власти", — заявляет Станислав Богданкевич, бывший глава Центрального банка и реформаторский политический лидер.

В то время как активисты защиты прав человека протестуют, миллионы беднейших белорусских избирателей, похоже, одобряют президента.

В отличие от России, пенсии и зарплаты здесь выплачиваются вовремя. В случае необходимости правительство допечатывает деньги.

Новый российский премьер-министр Евгений Примаков избрал Минск, столицу Беларуси, маршрутом своей первой зарубежной поездки в сентябре. По словам чиновников, он вежливо выслушал критику господином Лукашенко реформаторского усердия предыдущих российских правительств и то, что тот превозносил более осмотрительную деятельность Примакова.

Известной амбицией Лукашенко является воссоединение Беларуси с Россией и Украиной. Он не отрицает заявлений оппозиционных лидеров о том, что хотел бы возглавить такой союз.

"В России есть политические силы, которые приветствовали бы Лукашенко в качестве президента", — говорит Валерий Карбалевич, аналитик из независимого центра "Стратегия".

Послушайте!

Наши СИЗО переполнены. Люди спят на цементном полу. А заключенные все прибывают и прибывают

